ABBA

**PROUD TO BE BELARUSIAN BUSINESS**

22.08.2023, Варшава

**Праўленне Асацыяцыі беларускага**
**бізнесу за мяжой**
info@abbabusiness.org
+ 48 797 002 890

**Саюз прадпрымальнікаў**
**і працадаўцаў (ZPP)**

Як нам стала вядома, Саюзам прадпрымальнікаў і працадаўцаў (ZPP) у шэраг сродкаў масавай інфармацыі быў накіраваны ліст ад 16.08.2023 года (далей – Ліст ZPP). Азнаёміўшыся з ім, мы лічым неабходным пракаментаваць шэраг заяваў, якія маюць прынцыповае значэнне для ўстанаўлення сапраўдных абставін справы і канструктыўнага вырашэння бягучай сітуацыі, каб працягнуць эфектыўна абараняць этычны бізнес з беларускімі каранямі за мяжой.

> The Union of Entrepreneurs and Employers ZPP offers consistent support to Belarusian entrepreneurs who want to open their business in Poland. Already in 2020, we were the first CEE-based organisation to support relocation processes of Belarusian companies. We successfully managed to relocate several large Belarusian software houses to Poland, a process about which we always kept the Polish government up to date. Furthermore, we have also helped dozens of smaller companies.

Мы з удзячнасцю і вялікай павагай ставімся да Польшчы і іншых краін, якія падтрымалі беларускі бізнес пасля падзеяў 2020 года і працягваюць падтрымліваць яго нягледзячы ні на што. Мы паслядоўна здзяйсняем падтрымку этычнага бізнесу з беларускімі каранямі за мяжой. Мы дапамагаем у рэлакацыі беларускім кампаніям, якія былі рэпрэсаваныя паводле палітычных матываў. Мы паважаем агульнапрызнаныя прынцыпы міжнароднага права, патрабаванні санкцыйнай палітыкі, правы і інтарэсы грамадзян. Мы паважаем палажэнні нацыянальных заканадаўстваў і ажыццяўляем сваю дзейнасць выключна ў межах прававога поля.

Нашая мэта – інтэграваць, абараняць інтарэсы і развіваць легальны і этычны бізнес прадпрымальнікаў з беларускімі каранямі для развіцця Новай Беларусі як незалежнай дэмакратычнай краіны. Місія і каштоўнасці Асацыяцыі неаднаразова публічна агучваліся,

яны таксама размешчаныя ў адкрытым доступе на афіцыйным сайце АВВА. Статут Асацыяцыі і Кодэкс бізнес-этыкі Асацыяцыі, якімі мы кіруемся, знаходзяцца ў адкрытым доступе.

Вось толькі некаторыя факты з дзейнасці АВВА: былі арганізаваныя і праведзеныя 4 беларускія бізнес-форумы (у Польшчы і Літве) і арганізавана больш за 20 адукацыйных бізнес-падзеяў, у якіх прынялі ўдзел больш за 2000 чалавек, праведзены конкурс бізнес-праектаў для кампаній з беларускімі каранямі з прызавым фондам 25 000 еўра, праведзена больш за 285 гадзін індывідуальных кансультацый па праве, падатковых пытаннях, кадрах, фінансах; з лютага 2023 года да Асацыяцыі ў якасці сяброў далучыліся 67 кампаній з беларускімі каранямі з 8 краін (Польшча, Літва, Латвія, Эстонія, Нямеччына, Чэхія, Сербія, ЗША), якія атрымліваюць нашу пастаянную падтрымку, распрацаваныя 4 мануалы па вядзенні бізнесу ў Польшчы, Літве, Латвіі і Эстоніі, 20 верасня ў партнёрстве з МЗС пройдзе чарговы беларускі бізнес-форум у Варшаве, 21 жніўня быў адкрыты прыём заявак на другі конкурс бізнес-праектаў для кампаній з беларускімі каранямі.

> We take pride in the fact that Poland is a country that welcomes Belarusians, and we hope it will remain so in the years to come. All the more so, we cannot afford to stay silent when a former employee of the Security Council of the Republic of Belarus tries to undermine, with the use of provocations and slander, our credibility and that of other organisations supporting Belarusians, while making a business model of using classified information and acquired know-how in the power structures of Lukashenko's regime.

Дадзенае сцвярджэнне з'яўляецца няпраўдзівым і нематываваным.

Да лета 2019 года Яўген Буры працаваў на пасадзе саветніка ў Дзяржаўным сакратарыяце Рады Бяспекі Беларусі, дзе адказваў за эканамічную бяспеку і развіццё бізнесу, займаўся распрацоўкай ліберальных эканамічных рэформаў, абаронай і развіццём прыватнага прадпрымальніцтва, не прадстаўляў сілавыя ведамствы, не займаўся пытаннямі ваенна-тэхнічнай сферы, не меў дачынення да якіх-небудзь абмежавальных захадаў і рэпрэсій, не з'яўляўся непасрэдна чальцом Рады Бяспекі. У лістападзе 2020 года Я. Буры быў вымушаны з'ехаць з Беларусі з прычыны пераследу паводле палітычных матываў, у сувязі з актыўным удзелам у мірных акцыях пратэсту супраць гвалту, беззаконня, парушэння правоў чалавека і захопу ўлады рэжымам А. Лукашэнкі. У 2020 годзе Я. Буры далучыўся да дэмакратычных сілаў, з'яўляецца прадстаўніком эканамічнага блоку офісу Святланы Ціханоўскай.

Ні Я. Буры, ані кіраўніцтва АВВА не ажыццяўлялі правакацый і не дапускалі паклёпу ў адносінах ZPP. 10.08.2023 года ў інтэрв'ю Я. Бурага блогеру і былому палітычнаму зняволенаму Аляксандру Кабанаву ў дачыненні да ZPP быў агучаны наступны факт, які мае месца ў рэчаіснасці, – партнёрства Belarus Business Center пры ZPP з кампаніяй REVERA,

якая вядзе дзейнасць у Беларусі і Польшчы адначасова, з'яўлялася партнёрам бізнес-канферэнцыі, якая адбылася ў Маскве 20 красавіка 2023 года, з удзелам пасла Беларусі ў Расеі з абмеркаваннем пытанняў імпартазамяшчэння і абыходу санкцыйнага заканадаўства ЕЗ. На нашу думку, у перыяд агрэсіўнай варварскай вайны, развязанай Расеяй ва Украіне, у перыяд узмацнення рэпрэсій рэжымам Беларусі супраць сваіх грамадзян і прадстаўнікоў бізнесу, такое партнёрства нясе вялізныя рэпутацыйныя рызыкі для ўсяго беларускага бізнесу за мяжой. Гэты факт ніяк не быў пракаментаваны ZPP.

This person is Yauheni Bury, the current head of the Association of Belarusian Business Abroad (ABBA), who, in disregard of the institutions of the Polish state established for this very purpose, claims the right to issue certificates of credibility to Belarusian citizens and entrepreneurs present in Poland, calling this process "verification". This activity is solely based on the knowledge and experience gained from his work for the regime apparatus, and is conducted in close cooperation with former operatives of the State Security Committee of the Republic of Belarus, i.e., the Belarusian KGB or the ministry of internal affairs.

Дадзенае сцвярджэнне з'яўляецца няпраўдзівым і нематываваным.

Пасля выезду з тэрыторыі Беларусі ніякіх кантактаў з дзяржаўнымі органамі, спецслужбамі і сілавымі ведамствамі Беларусі, рэжымам А. Лукашэнкі ні Я. Буры, ні хто-небудзь з каманды ABBA не меў і не мае. Якія-небудзь доказы зваротнага не былі прыведзеныя. Я. Буры неаднаразова праходзіў верыфікацыю на адсутнасць сувязяў з рэжымам А. Лукашэнкі, у тым ліку, у дзяржаўных органах Польшчы пасля правядзення праверак далі статус бежанства. Я. Буры і кіраўніцтва ABBA падпісалі і ў сваёй дзейнасці кіруюцца нормамі Кодэксу бізнес-этыкі Асацыяцыі (у прыватнасці, пп. а п. 2.1. і п. 3), паважаюць нормы нацыянальнага заканадаўства і прававыя інстытуты.

Працэдура верыфікацыі і роля ABBA наўмысна ці не, але разумеецца і прэзентуецца ZPP некарэктна.

Верыфікацыя (яна ў тэрміналогіі ABBA называецца "акрэдытацыя") з'яўляецца выключна ўнутранай працэдурай Асацыяцыі для праверкі кандыдатаў на сяброўства. Працэдура акрэдытацыі ўзнікла як рэакцыя на неабгрунтаваную дыскрымінацыю беларускіх бізнесаў за мяжой пасля пачатку вайны ва Украіне. Механізм распрацаваны спецыялістамі ABBA ва ўзаемадзеянні з бізнесам і міжнароднымі партнёрамі. Гэткія працэдуры не з'яўляюцца нечым незвычайным у бізнес-асяроддзі, а ўяўляюць сабой распаўсюджаную практыку ў дзяржаўных структурах, банках, прыватных кампаніях і асацыяцыях.

Падрабязна аб тым, што сабой уяўляе акрэдытацыя ABBA, публічна апісана ў артыкуле на партале Zerkalo.io, а таксама знаходзіцца ў адкрытым доступе на афіцыйным сайце ABBA.

Акрэдытацыя ажыццяўляецца выключна супрацоўнікамі ABBA. Ні былыя, ні дзейныя супрацоўнікі сілавых ведамстваў Беларусі ніякага ўдзелу ў акрэдытацыі не прымаюць, звесткі ад ABBA не атрымліваюць.

Звяртаем увагу, што прынядце рэзалюцыі ПАРЕ 20.06.2023 года таксама не мае на ўвазе абавязковага праходжання акрэдытацыі ABBA або іншых арганізацый, а прапануе толькі дадатковы інструмент, якім скарыстацца ці не выбірае кожны бізнес для сябе самастойна. Палажэнні рэзалюцыі ў цэлым маюць рэкамендацыйны характар. Для яе рэалізацыі яшчэ спатрэбіцца сур'ёзная сумесная праца прадстаўнікоў дэмакратычных сілаў, бізнес-супольнасцяў, замежных інстытуцый і банкаў.

Я. Буры ў артыкуле адзначае: «Калі атрымаецца ўзгадніць механізм акрэдытацыі, які будзе прызнавацца ўладамі, банкамі і замежнымі кампаніямі для мэтаў выключэння дыскрымінацыі у дачыненні да бізнесу з беларускімі каранямі, — гэта сапраўды дапаможа ўсім».

Цытата з адказу тэлеканалу «Белсат»: «Асацыяцыя вітае рашэнне ПАРЕ і лічыць яго важным і карысным. ABBA гатовая дапамагаць прадстаўнікам беларускіх дэмакратычных сілаў у выгнанні сваім досведам, кампетэнцыяй».

Такім чынам, сцвярджэнне ZPP супярэчыць сапраўднай ролі і парадку выкарыстання акрэдытацыі, як правамернага механізму абароны правоў і інтарэсаў Асацыяцыі і яе сяброў.

> Oblivious of Mr. Bury's past, ZPP helped to found ABBA in Poland. We prepared the founding documents, executed the registration process, and aided the organisation in obtaining a large grant for its operations. We quickly realised that it had been a mistake. As it turned out, the establishment of the organisation served Mr. Bury and his wife, ABBA's Vice-President Marina Girin, mainly to set up their own financial base instead of running a genuine business.

Дадзеныя сцвярджэнні з'яўляюцца непраўдзівымі і нематываванымі.

Інфармацыя аб папярэдняй працы Я. Бурага знаходзілася і знаходзіцца ў адкрытым доступе: напрыклад, навіна на партале Reform.by ад 14.12.2020 года, на партале dev.by ад 14.12.2020 года, у інтэрв'ю на сайце "Наша Ніва" ад 17.01.2021 года. Яна ніколі не хавалася ад публікі, у прыватнасці, ZPP дадзенай інфармацыяй валодала ў кастрычніку 2021 года (пры першым дзелавым кантакце) і падзяляла грамадзянскую пазіцыю Я. Бурага ў дачыненні да непрыняцця палітыкі рэжыму А. Лукашэнкі.

Мы ўдзячныя за падтрымку ZPP, аднак трэба звярнуць увагу на наступныя факты:
Фонд ABBA быў зарэгістраваны 20.09.2021. Знаёмства з кіраўніцтвам ZPP адбылося на

бізнес-форуме 22-23 кастрычніка 2021 года ў Варшаве. Такім чынам, фонд ABBA створаны без падтрымкі ZPP.

2 траўня 2022 года 10 бізнесоўцаў з беларускімі каранямі заснавалі і зарэгістравалі асацыяцыю ABBA. ZPP сапраўды тэхнічна дапамагаў з афармленнем дакументаў (што мы сапраўды шануем). Аднак ZPP не з'яўляліся ні заснавальнікамі, ні ўваходзілі ў органы кіравання ABBA, працэс рэгістрацыі ажыццяўлялі кампетэнтныя польскія органы на падставе нормаў заканадаўства, а выдаткі, непасрэдна звязаныя з рэгістрацыяй, аплачваліся ABBA самастойна.

ABBA атрымаў грант ад Еўрапейскай Камісіі як самастойная і незалежная арганізацыя, партнёрамі ABBA у гэтым гранце з'яўляюцца Гандлёва-прамысловая палата Польшчы (KIG) і Цэнтр сацыяльна-эканамічных даследаванняў CASE. ABBA сумесна з ZPP не ўдзельнічала ў падачы ніводнай заяўкі на атрыманне якіх-небудзь грантаў.

Сцвярджэнне ZPP «аб стварэнні ABBA выключна з мэтай асабістага ўзбагачэння Я. Бурага і М. Гірын» з'яўляецца няпраўдзівым і неабгрунтаваным і супярэчыць рэчаіснасці.

Асацыяцыя ажыццяўляе сваю дзейнасць праз органы кіравання. Пасля заснавання да працы ABBA далучыліся прадстаўнікі з камерцыі, прадпрымальнікі, вядомыя эканамічныя эксперты. У прыватнасці, дарадца Святланы Ціханоўскай па эканамічных рэформах Алесь Аляхновіч і кіраўнік даследчага цэнтру CASE Belarus Серж Наўродскі. Было створанае Праўленне як калектыўны выканаўчы орган ABBA. З прадстаўнікоў сябраў Асацыяцыі быў абраны кантрольны орган – Назіральная рада. Найвышэйшым органам кіравання з'яўляецца Вальны сход сябраў Асацыяцыі. Таксама быў сфармаваны склад дарадцаў ABBA з экспертаў у сваіх галінах. У іх лік увайшлі, напрыклад, распрацоўнік платформы "Голас" і аўтар праекту "Новая Беларусь" Павел Лібер, юрыстка Ганна Маціеўская, айцішнік, юрыст і былы выкладчык юрыдычнага факультэту БДУ Яраслаў Кот, заснавальнік і дырэктар кампаніі Iomico Мікалай Мурзянкоў.

Дзейнасць ABBA ажыццяўляецца ў адпаведнасці са Статутам і Кодэксам бізнес-этыкі ABBA. Мы празрыстыя і паслядоўныя ў сваіх дзеяннях, у выкананні кантрактаў на рэалізацыю праектаў з нашымі партнёрамі (у прыватнасці, Еўрапейскай Камісіяй, USAID, CIPE) і пры адстойванні інтарэсаў этычнага бізнесу з беларускімі каранямі за мяжой.

Я. Буры выступае на мерапрыемствах, у СМІ як прадстаўнік ABBA, аднак дзейнасць Асацыяцыі – гэта праца каманды прафесіяналаў, экспертаў, партнёраў Асацыяцыі, якая не ажыццяўляецца ў прыватных інтарэсах каго-небудзь. Якія-небудзь доказаў зваротнага ZPP не прывялі.

> We categorically and unconditionally terminated our cooperation with ABBA after Mr. Bury presented the aforementioned plan to "verify" Belarusian companies operating in Poland. We indisputably took it as an omen of Soviet-style racketeering and extortion. Today we see that ABBA remains a dead organisation with no real representation of its members. All its activities are focused on public fundraising, with which Mr. Bury and Mrs. Girin finance their day-to-day livelihood and travels around the world.

Дадзеныя сцвярджэнні з'яўляюцца непраўдзівымі і нематываванымі.

Як ужо было падрабязна апісана вышэй, правядзенне працэдуры верыфікацыі (акрэдытацыі) з'яўляецца добраахвотным і ўсвядомленым крокам бізнесу, які выказаў жаданне далучыцца да Асацыяцыі ABBA. Гэта механізм, які распрацаваны і ўжываецца ўнутры Асацыяцыі на падставе Статута Асацыяцыі. Факт уступлення або неўступлення ў ABBA не з'яўляецца падставай і ніяк не звязаны з фактамі магчымасці або немагчымасці вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці за мяжой. Вынікі акрэдытацыі (як унутранай працэдуры) не даюцца каму-небудзь без згоды кандыдатаў у сябры Асацыяцыі.

Памеры гадавога сяброўскага ўнёску Асацыяцыі размешчаныя адкрыта на сайце ABBA і на сёння складаюць, напрыклад, для ІП – 99 еўра ў год, для кампаніі з 9 работнікамі – 169 еўра ў год. Такія аплаты не з'яўляюцца нечым незвычайным (а тым больш супрацьпраўным) у асяроддзі асацыяцый і саюзаў. Так, напрыклад, ZPP вызначае ўнёскі ад сябраў Саюза. У Лісце ZPP змяшчаюцца неабгрунтаваныя абвінавачанні ў арганізацыі рэкету і вымагальніцтва. Вельмі сур'ёзныя абвінавачанні, якія не пацвярджаюцца якімі-небудзь доказамі з прычыны неадпаведнасці рэчаіснасці.

Сцвярджэнне ZPP аб Асацыяцыі як "аб мёртвай арганізацыі" з'яўляецца не толькі непраўдзівым, але і ганьбіць дзелавую рэпутацыю ABBA, чальцоў яе каманды, дарадцаў, экспертаў і сябраў Асацыяцыі. Сцвярджэнне ZPP ставіць пад сумнеў прафесійнасць міжнародных партнёраў ABBA, прадстаўнікоў дзяржаўных арганізацый і органаў, у тым ліку Польшчы.

Канкрэтныя факты адносна дзейнасці ABBA з лічбамі і паказнікамі мы ўжо прыводзілі на пачатку нашага адказу. Нашая штодзённая дзейнасць фіксуецца ў стужках навін афіцыйных каналаў ABBA у Facebook, Telegram, Instagram, LinkedIn, YouTube. Асноўная інфармацыя і найбольш значныя матэрыялы размешчаныя на афіцыйным сайце ABBA. Функцыянуе інфармацыйная лінія Асацыяцыі email (info@abbabusiness.org), Telegram, тэлефон (+ 48 797 002 890). Мы знаходзімся на сталай сувязі і падтрымліваем бізнес з беларускімі каранямі за мяжой.

ABBA публічна падтрымлівае санкцыйную палітыку супраць рэжыму А. Лукашэнкі, што адпавядае інтарэсам і польскага ўрада ў барацьбе за дэмакратычныя каштоўнасці.

Мяркуем, што гэты факт з'яўляецца адной з асноўных прычынаў канфлікту некаторых асоб і арганізацый з ABBA. Апаненты ABBA адкрыта заяўляюць, што гатовыя дапамагаць любому бізнесу з беларускімі каранямі, незалежна ад палітычных поглядаў, што наўпрост супярэчыць палітыцы дэмакратычных краін, у тым ліку Польшчы.

ABBA публічна заклікае да акрэдытацыі беларускага бізнесу за мяжой як дадатковага механізму абароны правоў добрасумленных прадпрымальнікаў ад дыскрымінацыі з боку заходніх партнёраў і сродку барацьбы з абыходам санкцыяў з боку рэжымнага бізнесу. Мяркуем, што гэта другая прычына, праз якую некаторыя асобы і арганізацыі спрабуюць канфліктаваць з ABBA.

Апроч згаданай інфармацыі, сёння ABBA – адзіная беларуская нацыянальна-арыентаваная бізнес-асацыяцыя.

ABBA робіць працу на карысць Беларусі (не злачыннага рэжыму А. Лукашэнкі) і дзеля будучыні Новай Беларусі. Уся дзейнасць ABBA накіраваная на фармаванне ўстойлівай супольнасці этычнага беларускага бізнесу, які зможа пасля дэмакратычных зменаў дапамагчы аднавіць эканоміку Новай Беларусі і развіць інстытуты прадпрымальніцтва.

ABBA адкрыта падтрымлівае дэмакратычны рух Беларусі. Шмат публічных падзеяў ABBA праводзіць пад ганаровым патранатам нацыянальнай лідаркі Святланы Ціханоўскай або з яе ўдзелам (напрыклад, чатыры беларускія бізнес-форумы ў Варшаве і Вільні), у супрацы з офісам (напрыклад, сумесная дэлегацыя ў Давосе). ABBA падтрымлівала сувязь са Святланай Ціханоўскай і Офісам, нягледзячы на тое, што асобныя донары і беларускія актары раілі гэтага не рабіць.

ABBA ўдзельнічае ў розных беларускіх грамадскіх ініцыятывах, уключаючы нядаўнюю дыяспаральную канферэнцыю "Яднайся!" у Варшаве. ABBA – адзіная арганізацыя з усёй супольнасці падтрымкі беларускага бізнесу, якая публічна падтрымала Марафон салідарнасці. На сваіх форумах мы таксама ўзнімаем праблемы дапамогі і падтрымкі палітычным зняволеным і іх сем'ям. На адным з форумаў мы далучыліся да акцыі напісання лістоў палітвязням, а на сёлетнім форуме ў Варшаве мы абмяркоўваем магчымасць правесці дабрачынны сайд-івэнт з Politzek.me.

---

Ліст ZPP не змяшчае абгрунтаванняў, аналізу і аб'ектыўнай ацэнкі рэальных абставін у сукупнасці. У прыватнасці, ZPP зрабілі нематываваныя высновы аб патэнцыйнай пагрозе з боку аднаго з кіраўнікоў ABBA. Мы сур'ёзна занепакоеныя вышэйзгаданымі сцвярджэннямі

ZPP, якія не з'яўляюцца вынікам праверкі дакладных і пераканаўчых доказаў, а базуюцца выключна на здагадках і эмацыйных заявах.

Згаданыя сцвярджэнні ZPP не адпавядаюць рэчаіснасці, дзеянням ABBA і яе кіраўніцтва, носяць ілжывы і ганебны характар.

Алесь Аляхновіч

віцэ-прэзідэнт ABBA, прадстаўнік ABBA у ЗША

Яўген Буры

прэзідэнт ABBA

Марына Гірын

віцэ-прэзідэнтка ABBA

Серж Наўродскі

віцэ-прэзідэнт ABBA, прадстаўнік ABBA у Літве, Латвіі і Эстоніі